Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
УА “Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт”
Кафедра беларускай філалогіі

*70-годдзю вызвалення*
*Беларусі прысвячаецца*



# У АПОШНЯЕ ІМГНЕННЕ

*(аповесць)*

**Выканаўца:**
Значонак Дар’я Аляксандраўна,
студэнт I курса фак-та ВСіП (гр. 4)

**Кіраўнік:**
Кузьміч Вольга Аляксандраўна,
дацэнт кафедры беларускай
філалогіі, заслужаны работнік
адукацыі БССР, выдатнік адукацыі

Мінск 2014

Адным з цёплых летніх вечароў 1943 года, калі нябёсы над аэрадромам ужо гарэлі яркім ружова-аранжавым колерам, над лесам пранесліся савецкія самалёты ЛА-5 – невялічкія, вёрткія, з прыгожымі кароценькімі крыламі. Яны ішлі па двое: вядучы – уперадзе, а другі, вядзёны, крыху ззаду і злева. Апошлі самалёт, на фюзеляжы якога стаяла вялікая лічба 7, чамусьці быў адзін... Можна было падумаць, што яму проста не хапіла пары, але людзі на аэрадроме з такой трывогай глядзелі ў пустое месца ў небе, што сэрца любога, нават зусім старонняга чалавека неспакойна забілася б ў грудзях, прадчуваючы трагедыю.

ЛА-5 зрабілі круг над полем і сталі па чарзе прызямляцца. Вось села першая пара, “чацвёрка” з “шасцёркай”, потым – другая, “дзявятка” з “пяцёркай”, а за ёю апусціўся і адзінокі самалёт нумар сем. Яны накіраваліся да ўзлеску і занялі свае месцы ў капанірах. Лётчык “сямёркі”, невысокі стройны хлопец у шлеме і сінім камбінезоне, адкінуў каўпак самалёта, неяк нервова прабег па крыле і таропка саскочыў на зямлю.

- Што здарылася? Дзе Клімчук? – усхвалявана спытаў крэпкі прысадзісты механік Віктар, які апынуўся каля “сямёркі” адразу ж, як толькі яна пад’ехала да капаніра.

Лётчык раздражнёна сарваў шлем з галавы, і нечакана высветлілася, што гэта не хлопец, а маладая жанчына з кароткімі чорнымі валасамі. Ёй можна было б даць гады дваццаць два, не болей, калі б не хмурныя цёмныя вочы, якія, напэўна, шмат чаго пабачылі за гэту вайну. Зараз у позірку жанчыны стаялі гнеў і адчай, прыкрасць і віна...

- Няма больш Клімчука, - хрыплавата, прыдушана адказала яна.

Віктар адразу панік і не змог нічога вымавіць, толькі прыгнечана ўздыхнуў. На яго наіўным, па-хлапечы круглым твары з’явілася непрытворнае гора. А жанчына нечакана глянула яму за спіну і раўнадушна сказала:

- А зараз, напэўна, не стане і мяне.

Віктар азірнуўся: ад каманднага пункта да іх рашуча шагаў маёр Дубоўка, камандзір трэцяй эскадрыллі. Здаецца, ён быў нечым раззлаваны.

- Але ў чым справа, Ліда? – не зразумеў Віктар.

- Хутка даведаешся.

Жанчына груба сунула яму ў рукі шлем, незнарок пхнуўшы ў грудзі, і цвёрдым крокам пайшла насустрач камандзіру. На яе твары застыў выраз сярдзітай упартасці, і чым меншай станавілася адлегласць паміж ёю і начальнікам, тым вышэй узнімаўся яе падбародак.

Нарэшце маёр Дубоўка апынуўся насупраць Ліды. Гэта быў шыракаплечы цёмнавалосы мужчына, яшчэ даволі малады, але ўжо з прыкметнай сівізной, якая бязлітасна серабрылася на скронях. Звычайна маёра цяжка было вывесці з раўнавагі, але зараз ад былога спакою і разважлівасці не засталося і следу. Адразу было бачна, што Дубоўка збіраецца весці сур’езную размову і што размова гэтая не закончыцца для Ліды нічым добрым.

Жанчына выцягнулася ў струнку, казырнула і падкрэслена афіцыйна, але вельмі суха сказала:

- Таварыш маёр, дазвольце далажыць...

- Не дазваляю! – рэзка абарваў яе Дубоўка. – Самае галоўнае мне ўжо далажылі! А іменна тое, што вы, старшы лейтэнант Жук, безразважна атакавалі “месершміт” з нязручнага становішча, забыўшыся, што вы вядучы і што ў вас ёсць вядзёны, які абавязаны ў любых абставінах ляцець за вашым самалётам!

Паціху пачалі падыходзіць астатнія лётчыкі, якія ўдзельнічалі ў сённяшнім вылеце, а таксама некаторыя механікі. Яны моўчкі стаялі цесным паўкругам і назіралі за гэтай не вельмі прыемнай сцэнай, не робячы спробы ўмяшацца.

Распаліўшыся, маёр яшчэ больш павысіў голас, ён ужо амаль крычаў:

- Калі вы ішлі ў атаку, павінны былі падумаць, ці будзе гэта бяспечна для Клімчука, ці зможа ён трымацца каля вас! У рэшце рэшт ён жа толькі месяц назад далучыўся да нашай эскадрыллі, у яго зусім не было вопыту! Самі таго не ведаючы, вы прымусілі яго накіраваць самалёт прама пад кулявыя трасы немцаў! Дзе было ваша тонкае адчуванне паветраных бітваў, дзе былі вашы здольнасці да вокамгненнага прыняцця верных рашэнняў, дзе было майстэрства, якое вы да гэтага часу паказвалі на трэніроўках і баявых вылетах? Магчыма, праз некалькі тыдняў вы былі б ужо капітанам, калі не камандзірам якой-небудзь эскадрыллі!.. І пры ўсіх вашых ведах, усіх навыках вы сляпа кінуліся на чужы самалёт, як каршун на здабычу, і нават не ўспомнілі пра даручанага вам зялёнага юнака!..

Ліда Жук слухала яго амаль безуважна, з адной толькі ледзяной ветлівасцю. Аднак маска абыякавасці, нацягнутая на яе твар, час ад часу быццам разыходзілася па швах, і ў жанчыны то нервова перасмыкваліся вусны, то крапчэй сціскаліся сківіцы – нібы забаранялі недапушчальна грубым фразамірвацца на волю. Пры апошніх словах Дубоўкі Ліда ўсё ж такі не вытрывала.

- Каб вы ведалі, - холадна сказала яна, - для маёй атакі была важкая падстава: я ратавала жыццё Глебу Федарэнку. Калі б я не прыйшла яму на дапамогу, ён таксама не вярнуўся б з бою.

Сярод лётчыкаў пачуўся сярдзіты выгук, і ўперад выскачыў сам Федарэнка – сутулаваты мужчына з нядобрымі, нейкімі калючымі вачамі.

- Мне не патрэбна была твая дапамога! – злосна прашыпеў ён, апярэджваючы маёра. – Той “месер” не прадстаўляў для маёй пары ніякай пагрозы, мы са Слаўкам проста паднырнулі б пад яго і...

- І трапілі напрасцяк у падвойныя “клешчы” немцаў, - жалезным тонам працягнула Ліда, змяраючы Федарэнку пагардлівым поглядам.

Той быццам папярхнуўся ўласнымі словамі, але адразу знаўшоўся:

- У любым выпадку я сам вырашыў бы свае праблемы, бо я – старшы лейтэнант, і нават ты не зможаш сказаць, што я атрымаў гэтае званне незаслужана! Каму трэба было дапамагаць, дык толькі не мне! Вось Сярожка... – Тут Глеб нечакана асёкся, але праз пару секунд сіпла дагаварыў: - Вось Сярожка быў усяго толькі старшым сяржантам.

Твар Ліды акамянеў, толькі здрыганулася скула. Маёр Дубоўка, змагаючыся з голасам, цераз сілу сказаў:

- І гэта вяртае нас да вашага ўчынку, Ліда. – Цяпер ён гаварыў ціха і глуха, як смяротна стомлены чалавек. – Замест таго каб ўратаваць свайго вядзёнага, вы кінуліся на дапамогу тым, каму яна не патрабавалася, і вынікам гэтага стала смерць маладзейшага з нашых лётчыкаў. Канешне, я дапускаю, што...

- Хопіць ужо пра гэта! – раптам пранізліва крыкнула Ліда, і ўсе мімаволі падскочылі. Цёмныя вочы жанчыны гарэлі лютасцю, пераплеценай з адчаем, а голас быў надламаным, перарывістым. – Я ведаю, ведаю, што я зрабіла, не трэба паўтараць гэта па сто разоў! Адчапіцеся ад мяне! Я не дазволю вам павучаць мяне, як нейкае дзіця, я дарослы чалавек і сама магу зразумець, што я зрабіла добра, а што дрэнна! Сама неяк разбяруся, без вас!

Нейкі малады лётчык, зграбны бялявы хлопец, уражана адступіў, гледзячы на Ліду адначасова са страхам і надзвычайным асуджэннем; многія непрыхільна пакруцілі галовамі.

Бровы маёра пачалі павольна, пагражальна сыходзіцца на пераноссі, аднак старэйшы з лётчыкаў, худы высачэзны капітан Зелянкоўскі з абветраным няголеным тварам, паклаў руку на плячо Дубоўкі і супакойваючым тонам вымавіў:

- І сапраўды, хопіць, Рыгор. Няўжо ты не бачыш, што з ёю робіцца? Яшчэ некалькі хвілін такой напружанай размовы – і Ліда разарвецца на часткі ад супярэчлівых пачуццяў. Не будзь з ёю такім патрабавальным,

дзяўчына сёння слаўна папрацавала. З шасці збітых нямецкіх самалётаў палова належыць ёй. Нават у мяне не атрымалася знішчыць больш, чым два, а Ігнат і ўвогуле можа пахваліцца толькі адным.

Бялявы хлопец кінуў на Зелянкоўскага здзіўлены позірк і вельмі абурана спытаў:

- Дзядзька Мацвей, няўжо вы спрабуеце яе выгарадзіць? Навошта? Сярожка ж загінуў з-за яе гарачнасці, непакорнасці, стыхійных дзеянняў! Я лічу, сваім учынкам яна заслужыла жорсткае пакаранне! Несправядліва, што вы яе хваліце!

- От і я пра тое! – імгненна ўклініўся Глеб Федарэнка, злосна сціскаючы рукі ў кулакі. – Можа, у наступны раз Лідцы прыйдзе ў галаву адарвацца ад эскадрыллі, калі мы будзем атакаваны не трыма няшчаснымі звёнамі, а велізарнай групай нямецкіх знішчальнікаў! Лідка і сама загіне, і ўсіх нас паставіць пад удар! Куды лепш навучыць яе розуму зараз, чым потым пакутаваць.

Убачыўшы, што Ліда гнеўна ўскінула галаву, Мацвей Зелянкоўскі сурова асадзіў Федарэнку:

- Сціхні, Глеб! Ты добра ведаеш, што яна ніколі не зробіць нічога падобнага, таму не смей нават гаварыць такое глупства! – Ён павярнуўся да прыгожага бялявага хлопца і больш мякка сказаў: - Ты таксама не маеш рацыю, Ігнат. У некаторых выпадках у чалавека проста няма часу, каб зразумець, што адбудзецца з-за яго ўчынку. Для разважанняў застаюцца толькі кароткія секунды, а рашэнне трэба прыняць абавязкова. Чалавек кідаецца ад адной думкі да другой, унутрана мярцвее, сціскаецца, а потым са сляпым шаленствам здзяйсняе першае, што прыйдзе ў галаву... А бывае і па-іншаму. Пачнуць людзі нешта рабіць – а праз адзін удар сэрца на іх навальваецца страшэннае разуменне таго, што вынікі будуць фатальнымі... Вярнуць час на імгненне назад нельга, спыніцца немагчыма, можна толькі працягваць рабіць непапраўнае, махнуўшы на ўсё рукой...

Ліда страшна пабялела, вочы яе шырока расплюшчыліся і ашклянелі. Ніхто гэтага не заўважыў: усе глядзелі на капітана Зелянкоўскага і Ігната. Апошні, нахмурыўшыся, якраз прамовіў:

- Хіба мы гаворым пра нейкіх абстрактных людзей? Размова ідзе менавіта пра Ліду, і мы павінны зыходзіць з асаблівасцей яе характару. Яе імкненне да самастойнасці вядома ўсяму палку, а ў паветраным баі лётчык абавязаны няўхільна падпарадкоўвацца загадам камандзіра. Калі ты сам па сабе, калі не слухаеш нікога і нічога, акрамя ўласнага розуму, дык які ж гэта паветраны бой і які ж ты лётчык?

Тут Ліду зноў прарвала.

- А які ж ты лётчык, - закрычала яна, - калі бачыш, што камусьці з тваіх пагражае небяспека, але застаешся на месцы, бо табе, бачыце, загадалі! Няўжо гэта па-чалавечы? Нават такія нікчэмныя, няўдзячныя людзі, як гэты, - яна злосна матнула галавой у бок Федарэнкі, - вартыя таго, каб іх ратаваць! Пакуль будзеш разважаць, ці можна пайсці супраць загаду, чалавека ўжо заб'юць і стане позна!

Маёр Дубоўка, не сцярпеўшы, сярдзіта, грозна прагрымеў:

- Вы яшчэ асмельваецеся павышаць голас у прысутнасці камандзіра? Вось што я вам скажу: з сённяшняга дня вы больш не будзеце ўзначальваць звяно, а таксама не атрымаеце новага вядзёнага! Мяркуючы па таму, як вы прытрымліваецеся дысцыпліны, вам нельга даручаць выхаванне маладых лётчыкаў! Спачатку вы самі навучыцеся бездакорна выконваць загады старшых па званні, і толькі пасля гэтага набудзеце правы на некаторую свабоду дзеянняў. А пакуль вам прыйдзецца зноў апынуцца ў шкуры вядзёнага, каб даведацца, што ж такое паслухмянства.

Убачыўшы Лідзін твар, які перасмыкнуўся ад гневу і зневажання, Дубоўка жорстка дадаў:

- Шчыра гаворачы, я ўвогуле павінен адхіліць вас ад палётаў, але я не зраблю гэтага, хаця і ўпэўнены, што потым мне давядзецца пашкадаваць.

Адзін наш лётчык загінуў, самалёт другога ў жудасным стане, трэці ў шпіталі са шматлікімі пераломамі... Зараз нашай эскадрыллі як ніколі патрабуюцца людзі. Таму я не пазбаўляю вас магчымасці прымаць удзел у вылетах, але зусім не па той прычыне, што лічу, быццам вы зможаце прынесці істотную карысць. Вам усё зразумела, старшы лейтэнант Жук?

- Так точна! – з выразнай нянавісцю ў голасе працадзіла Ліда.

- А цяпер вы адправіцеся ў камандны пункт і дакладзяце начальніку штаба пра тое, што вы паспелі нарабіць. Мне і так ужо прыйшлося за вас чырванець, калі наземны паведаміў, якія справы адбываюцца ў паветры, таму вы пойдзеце туды адны і самі выслухаеце ўсё, што думаюць пра вас камандзір палка і начальнік штаба. Можаце нават паспрабаваць і там пакрычаць, але мне здаецца, што нічым добрым гэта не скончыцца!

- Дазволіце ісці? – праз зубы спытала Ліда, не зводзячы з Дубоўкі позірку, у якім бушавала полымя.

- Ідзіце! – адрывіста сказаў маёр.

Ліда рэзка павярнулася і шпарка, сярдзіта пакрочыла прэч. Са спіны ў сваім лётным сінім камбінезоне яна выглядала зусім як хударлявы хваравіты хлопец гадоў васямнаццаці...

Усе моўчкі глядзелі Лідзе ўслед.

- Шкада яе... – нягучна выдыхнуў хтосьці з лётчыкаў.

Дубоўка гнеўна страсянуў галавой.

***

У вясковай сталоўцы было вельмі шумна: зараз тут вячэралі лётчыкі-знішчальнікі, механікі, шафёры бензацыстэрнаў, работнікі з санчасці і метэаралагічнай станцыі – карацей, усе тыя, хто з самага світанку працаваў на аэрадроме і для яго. За адным са сталоў сядзеў Рыгор Дубоўка і час ад часу акідваў памяшканне безуважным позіркам, якім лёгка выхопліваў людзей сваёй трэцяй эскадрыллі. Вось малодшы лейтэнант Ігнат Міхалёнак; звычайна такі радасны, з мяккай нясмелай усмешкай на

прыгожым юнацкім твары, цяпер ён сумна хмурыўся, гледзячы ў талерку. Побач з ім размясціліся чарнявыя браты Арцём і Максім Варановічы, абодва старшыя сяржанты. У лётнай школе яны вучыліся разам з загінуўшым Сярожкам Клімчуком, толькі ў полк прыбылі трохі раней. Смерць таварыша таксама пакінула на іх свой адбітак, і яны сталі нейкімі ціхімі, прыгнечанымі. Крыху далей Глеб Федарэнка гучна перагаворваўся са сваім вядзёным, лейтэнантам Слаўкам Новікам, які быў рухавым тварыскім хлопцам і сябраваў з добрай чвэрцю палка. Слоў было пачуць немагчыма, але па ўпартых выразах твараў Дубоўка здагадаўся, што яны спрачаюцца. Нетаропкі шыракаплечы Лёва Русак (лейтэнант, як і Слаўка) не ўмешваўся ў размову, толькі іншы раз са спакойнай цікавасцю паглядваў то на аднаго, то на другога.

Рыгор Дубоўка, зірнуўшы на тое, з якім жарам жэстыкуляваў Слаўка Новік, прыйшоў да высновы, што яны гавораць пра Ліду Жук. Здарэнне, у якім яна адыграла галоўную ролю, выклікала нямала шуму. “І Слаўка, напэўна, выступае абаронцам Ліды”, - незадаволена падумаў Рыгор, які ведаў, што Новік з самых першых дзён знаходжання на аэрадроме быў адным з тых нямногіх людзей, каму яна сапраўды давярала.

Дубоўка мімаволі павярнуўся і паглядзеў у той бок, дзе раней прыкмеціў Лідзіну галаву з чорнымі, як ноч, раскудлачанымі валасамі. Маладая жанчына ў адзіноце сядзела ля акна, прыгорбіўшыся і хмурна ўтаропіўшыся ў вечаровую цемру. Маёр да таго прызвычаіўся бачыць яе прамой, як бярозка, з узнятым падбародкам і па-ваеннаму выпрастанымі плячыма, што на некалькі імгненняў яму здалося, быццам гэта зусім другі, незнаёмы чалавек. Ды і сваімі паводзінамі гэтая Ліда зусім не была падобная на ранейшую: тая амаль заўсёды знаходзілася ў памяркоўна вясёлым, крыху іранічным настроі, і хоць часам у яе характары з’яўлялася некаторая рэзкасць, усё ж такі Рыгор хутчэй аддаў бы перавагу менавіта

той Лідзе, чым гэтай панурай, маркотнай істоце, якая нават на стуле сядзела неяк скасабочана, бы змёрзлы верабей.

“Але такой ёй і належыць быць! – нахмурыўся Рыгор. – Калі чалавек зрабіў нешта дрэннае, ён павінен адчуць пакуты сумлення, а інакш ён страчаны для людзей”.

Мацвей Зелянкоўскі, якога лётчыкі трэцяй эскадрыллі любілі называць проста дзядзькам Мацвеем, убачыў накіраваны на Ліду непрыхільны позірк Дубоўкі і ціха сказаў:

- Яшчэ раз табе гавару, з ёю так нельга. Чуеш, Рыгор? Ёй шчыра, амаль да слёз шкада Сярожку, яна і сама ведае, што толькі з-за яе ён загінуў. Навошта было ўшчэнт растоптваць яе перад усімі? Ліда і без гэтага вельмі перажывае.

- Я – камандзір эскадрыллі, - рэзка сказаў Рыгор, - і я павінен клапаціцца не пра Лідзіны пачуцці, а пра тое, каб мае лётчыкі засталіся ў жывых.

Мацвей пранікліва паглядзеў на яго.

- Ты проста не можаш прабачыць сабе тое, што сам не павёў эскадрыллю ў бой, - нягучна прагаварыў ён. – Ты лічыш, што Сярожка не загінуў бы, калі б ты ўзяў камандаванне на сябе.

- Не, я давяраю табе нават больш, чым сабе самому, - адмоўна матнуў галавой Рыгор. – Таму я і назначыў цябе кіраўніком той аперацыі. Справа ўвогуле не ў гэтым... – Ён стомлена ўздыхнуў, і яго голас стаў менш рашучым, амаль няўпэўненым. – Разумееш, мне вельмі крыўдна, што памылку зрабіла менавіта Ліда. Яна разумная, таленавітая, яна віртуозна кіруе самалётам... Яна так з ім зраслася, што з лёгкасцю выконвае такія небяспечныя фігуры пілатажу, за якія я сам вазьмуся з асцярогай. Хто б мог падумаць, што жанчына – адзіная жанчына ў палку! – можа быць лепшым лётчыкам, чым многія мужчыны?! У будучым яна можа стаць такім майстрам паветраных баёў, што яе ўсюды будуць сустракаць з

распасцёртымі абдымкамі!.. Ну, ты ведаеш, мы з табой ўжо гаварылі пра гэта. Але і недахопаў у Ліды таксама хапае! Праўду гаварыў Міхалёнак, яна занадта самастойная, імкнецца рабіць так, як сама жадае. Гэта вельмі дрэнная якасць для лётчыка. Зразумела, у некаторых выпадках ад нас патрабуецца якраз праявіць ініцыятыву, але часцей за ўсё сітуацыя залежыць ад таго, наколькі згуртавана нападае ці абараняецца эскадрылля. З такімі, як Ліда, мы рана ці позна пацерпім паражэнне, і сённяшні выпадак, мне здаецца, першая ластаўка.

- Ты перабольшваеш, - паморшчыўся Зелянкоўскі. – Некаторыя праблемы з дысцыплінай у Ліды, канешне, ёсць, але яна зусім не так часта грэбуе загадамі. Ды яна нават не грэбуе, толькі робіць крышачку па-свойму. Бачыў, якія ў яе заўсёды прамыя плечы і спіна? Ліда ганарыцца тым, што з'яўляецца падначаленай і падпарадкоўваецца камандзіру. А наконт яе свабодалюбства... Як мне здаецца, яно хутка пройдзе. Дзяўчына яна, як ты сам сказаў, вельмі разумная, таму тое, што здарылася з Сярожкам, абавязкова падкажа ёй, што свае звычкі трэба неяк мяняць.

- Можа, і сапраўды, - нехаця згадзіўся Рыгор. – Я ўжо не ведаю...

Нечаканна пачуўся нечы ўзбуджаны крык:

- Гэй, братачкі, пошта! Пошта!

Сталоўка адразу захоплена загаманіла, загула; усе людзі без выключэння тут жа павярнуліся да дзвярэй, у якія толькі што ўвайшла смуглявая кучаравая дзяўчына з аб'ёмістай сумкай.

- Ура, Маланка прыйшла!

- Як добра! Даўно пара!

- Што прынесла нам, Маланка-Маланачка?

Дзяўчына заўсміхалася і бліснула цёмнымі гарэзлівымі вачыма, назіраючы за тым, як людзі таропка ўскокваюць з месцаў і імкнуцца апынуцца як мага бліжэй да яе чароўнай сумкі, у якой было паўнютка доўгачаканых лістоў ад сяброў і родных. Рыгор са здзіўленнем убачыў,

што нават Ліда імгненна ўскінула галаву і ажывілася. Яе позірк зрабіўся прамым і ясным, як раней, і яна стала прагна, але з некаторай бояззю сачыць за паштальёнам. З месца чамусьці не скранулася, толькі напружылася, як драпежная кошка перад скачком.

- Яе апошні ліст да маці вярнуўся назад, - шапнуў Мацвей, быццам падслухаўшы думкі Дубоўкі. – Цяпер трывожыцца, спадзяецца, што тая проста была вымушана некуды пераехаць і хутка напіша сама.

“І адкуль ён усё ведае?” – неўразумела падумаў Рыгор, спрабуючы задушыць у сабе мімавольны жаль да Ліды.

Тым часам дзяўчына Маланне пачала раздаваць пошту. Яна, здаецца, усіх тут ведала.

- На, Прохараў, і скажы сваім, каб пісалі большымі літарамі, а інакш у наступны раз проста не вазьмуся разбіраць гэтыя казяўкі. Паберажы мае вочы. Проста не ведаю, як гэтыя лісты дайшлі!.. Табе, Міцька, сёння нічога, але я чула, што пошта з тваіх мясцін затрымліваецца з-за баявых дзеянняў, таму чакай... Міхалёнак, што гэта за дзяўчына табе піша? Такое ўражанне, што па тры разы ў дзень лісты адпраўляе! Мабыць, нявеста, га?

Ігнат вельмі пачырванеў і паспешна забраў канверты, а потым схаваўся ў нейкі куток і стаў адкрываць іх дрыготкімі ад хвалявання рукамі. Яго вочы свяціліся мяккай радасцю і пяшчотай.

Рыгор чакаў, з хлапечым нецярпеннем гледзячы, як пусцее сумка Маланні. Ну калі ўжо, калі? Няўжо няма для яго лістоў? Яго нецярпенне пачало пераходзіць у лёгкі неспакой, калі Маланне нарэшце выгукнула:

- Дубоўка! Ці ёсць Дубоўка?

- Я тут! – ускінуў руку Рыгор, і яго сэрца моцна-моцна закалацілася ў грудзях. Цяпер не было розніцы паміж ім і іншымі людзьмі ў гэтым пакоі: усе яны аднолькава чакалі звестак ад сваіх родных. Сяржанты і генералы становяцца роўнымі, калі на парозе з’яўляецца постаць паштара...

- А я вас і не заўважыла, - дружалюбна сказала Маланння, прабіраючыся да яго стала цераз натоўп. – Вось, трымайце, таварыш маёр!

У руках Рыгора апынулася ажно чатыры лісты – сапраўдная каштоўнасць!

- Дзякуй, Маланачка, - з удзячнасцю сказаў ён ахрыплым голасам.

- А гэта вам, таварыш капітан, - дадала Маланння і ўручыла некалькі лістоў Зелянкоўскаму. Потым яна павярнулася да тых, хто з надзеяй таптаўся побач з ёю, і настойліва вымавіла: - Усё, больш няма! Гэтыя былі апошнія! Разыдзіцеся, даражэнькія, дазвольце прайсці! У наступны раз пашчасціць!

Рыгор нічога вакол сябе не бачыў і не чуў, усёй яго ўвагай авалодалі лісты. Не спяшаючыся іх чытаць, ён з задавальненнем угледзеўся ў добра знаёмыя почыркі на канвертах. Адзін ліст быў ад малодшай сястры, а тры іншых – ад сяброў, з якімі ён некалі вылятаў на паветраныя баі з немцамі. Колькі ўспамінаў, і добрых, і дрэнных, адразу ўспыхнула, ажыло! Колькі пачуццяў ускалыхнулася ў грудзях цёплай хваляй! Некаторы час маёр проста трымаў лісты ў руках, ледзь-ледзь дакранаючыся пальцамі да паперы, а потым беражліва схаваў пад камбінезон, за пазуху.

Зелянкоўскі падняў доўгі няголены твар ад аднаго са сваіх лістоў. Ён адкрыў яго адразу ж, як толькі атрымаў. Вочы капітана ззялі.

- Жонка піша, што Галя, мая старэйшая, пачала дапамагаць ёй у шпіталі, - з гордасцю сказаў ён. – І ў яе так добра атрымліваецца прыглядаць за хворымі, што старшая медсястра з яе не нарадуецца.

У адказ Дубоўка лагодна ўсміхнуўся. Ён ужо ўяўляў, як прыйдзе да сябе ў зямлянку, сядзе каля газавай лямпы і пачне чытаць лісты пры яе жоўтым агеньчыку, які будзе мяняцца і калыхацца, быццам жывы, кідаючы мудрагелістыя цені на імправізаваныя сцены і пол...

Рыгор азірнуўся, і яму нечакана стала вельмі сорамна за яго радасць, і за мары, і за чатыры лісты, якія так прывабна пахруствалі за пазухай. Ліда

Жук ізноў абыякава глядзела ў акно, хаця за ім ужо проста немагчыма было ўбачыць штосьці, акрамя начной цемры і ўласнага адлюстравання. Ніякіх лістоў да яе не прыйшло.

***

Наступнай раніцай трэцяя эскадрылля атрымала загад разабрацца з вялікай групай нямецкіх самалётаў МЕ-109. Каля дваццаці "месершмітаў" няўхільна рухалася ў бок савецкага аэрадрома, і хаця ніхто дакладна не ведаў, з якой мэтай, навіна была несуцяшальная. Многія лічылі, што гэта простае супадзенне, бо калі б немцы вызналі пра аэрадром і вырашылі яго бамбіць, то яны выслалі б не звычайныя самалёты-знішчальнікі, а бамбардзіроўшчыкі накшталт "Юнкерсаў-88". Аднак "месершміты" ў любым выпадку нельга было падпускаць блізка, таму эскадрыллі маёра Дубоўкі даручылі падняцца ў паветра і адправіцца ім насустрач.

У іх яшчэ было трохі часу, і Дубоўка скарыстаў яго, каб сабраць усіх у камандным пункце і сказаць некалькі слоў пра вылет.

- На гэты раз удзельнічаць будзем усе. Зразумела, за выключэннем цябе, Міхееў, раз твой самалёт яшчэ не паспелі вярнуць у працаздольны стан. Такім чынам, нас дзевяць. Улічваючы тое, што зусім нядаўна вы, Федарэнка і Новік, змаглі ўдваіх разагнаць дзесяць варожых знішчальнікаў, то ў дзевяці самалётаў супраць дваццаці ёсць нямалыя шансы на перамогу, застаецца толькі правільна спланаваць ход бітвы. Цяпер крыху пра баявы парадак...

Ліда Жук адразу насцярожылася, успомніўшы ўчарашнюю пагрозу камандзіра эскадрыллі. Ці прывядзе ён яе ў выкананне? Ці сур'ёзна ён гаварыў пра тое, што цяпер яна будзе вядзёнай? Маладая жанчына і без таго знаходзілася ў хмурнаватым, некалькі нервовым настроі: яна вельмі дрэнна спала гэтай ноччу і адчувала цяжкую стомленасць, ад якой гукі чуліся неяк глухавата. Да таго ж Ліду пакуль не адпусціла бязлітаснае, пакутлівае разуменне сваёй віны – віны перад русавалосым Сярожкам

Клімчуком, зусім яшчэ хлопчыкам, якому ледзь-ледзь споўнілася дзевятнаццаць... У свае дваццаць два гады Ліда ўжо адчувала сябе сталай, мудрай, адказнай за жыццё ўсіх, хто быў маладзейшы за яе, і хоць паміж імі з Сярожкам было толькі тры гады розніцы, але яна бачыла ў ім малое дзіця, якое трэба ахоўваць і падтрымліваць. Нават сам ён часта прызнаваўся, што пачаў успрымаць яе як сваю старэйшую сястру. І тым недарэчней, тым няправільней здавалася та трагедыя, што адбылася ўчора... Усё здарылася так, як і апісваў Зелянкоўскі: не задумваючыся, Ліда проста рынулася на “месершміт” зверху, а праз секунду раптам натрапіла поглядам на другі нямецкі самалёт, які выскачыў няведама адкуль і панёсся ў атаку на “дзясятку” Клімчука. Жанчына паспрабавала спешна выйсці з пікіравання, але было ўжо позна, і самалёт Сярожкі літаральна сам падставіўся пад кулявыя трасы...

Гэтыя ўспаміны зноў і зноў нажом паласавалі сэрца Ліды, а ўсе навокал быццам назнарок пачалі чапляцца да яе, ушчуваць, патрабаваць для яе пакаранне... Ёй было балюча, вельмі балюча, а ніхто не бачыў гэтага! Хіба, можа, толькі дзядзька Мацвей ды Слаўка Новік... Ну як было не адказаць рэзкасцю на ўпартае неразуменне? Не ў характары імпульсіўнай Ліды было прабачаць духоўную слепату і глухату!

Аднак сёння Ліда ўжо крыху супакоілася. Члены трэцяй эскадрыллі ў адносінах да яе неяк памякчэлі, нават Ігнат перастаў кідаць у яе бок абураныя погляды. Мабыць, яны заўважылі цёмныя кругі, якія з’явіліся пад яе вачамі пасля бяссоннай ночы... Але як бы там ні было, Ліда парадавалася спакою і змагла расслабіцца, не чакаючы ўдару з усіх бакоў адразу. Выглядаць слабай яна па-ранейшаму не хацела, таму працягвала трымацца з іншымі суха і даволі абыякава. Яе спіна была вельмі роўнай, быццам закамянелай, а вочы нічога не выражалі.

- ...У апошні час мы ляталі або двойкамі, або чацвёркамі, але сёння зноў пойдзем трыма звёнамі па трое, - гаварыў Рыгор Дубоўка. – Як і

звычайна, вылучым групу рэзерву з самых вопытных лётчыкаў, каб яны прыкрывалі нас зверху і адначасова знішчалі асобныя нямецкія самалёты, якія адарвуцца ад астатніх.

Ліда і брывом не варухнула, нягледзячы на тое што часцей за ўсё яна ўваходзіла менавіта ў групу рэзерву. Ясна як двойчы два чатыры, што цяпер яе ніхто туды не паставіць, бо яна больш не значыцца сярод “самых вопытных лётчыкаў”. Ліда разумела гэта вельмі і вельмі добра, таму лёгка захавала спакойны выраз твару, калі маёр сказаў, што група рэзерву пойдзе пад кіраўніцтвам капітана Зелянкоўскага, які возьме з сабой Ігната Міхалёнка і Лёву Русака. Увогуле гэта было прадказальна. Мацвей быў такім жа добрым лётчыкам, як сам маёр, таму яму можна было даверыць любыя складаныя аперацыі. Нетаропкага, а часам і марудлівага Лёву паважалі за мядзведжую здольнасць у патрэбны момант станавіцца спрытным і небяспечным. А таленавітага маладога хлопца Ігната нярэдка пасылалі ў самыя гарачыя бітвы, і ён з усім спраўляўся выдатна, хаця і быў толькі малодшым лейтэнантам.

- Два астатнія звёны ўзначалім мы з Федарэнкам, - працягваў Рыгор. – З табой, Глеб, паляцяць Арцём і Слаўка, ну а для майго звяна, зразумела, застаюцца Максім і Ліда.

Ліда востра ўгледзелася яму ў твар у пошуках ўчарашняга гневу і пагарды, але не знайшла іх і, яшчэ больш, нават не змагла вызначыць, якія пачуцці ім валодалі. Магчыма, што і ніякія, бо наперадзе была бітва і на ўсе канфлікты трэба было забыцца да яе канца.

Але як даведацца, што прымусіла Дубоўку ўзяць яе, Ліду, сабе ў вядзёныя? Няўжо ён ўсё-такі быў гатовы прызнаць, што яму патрэбен яе вопыт? “Не, хутчэй ён хацеў падкрэсліць, што цяпер будзе трымаць мяне каля сябе, каб не даць нарабіць дурасцей”, - з халадком падумала Ліда.

Арцём Варановіч спытаў:

- І чаму гэта немцы кожны раз пасылаюць у бой адны толькі “месершміты”? У іх жа ёсць новенькія штурмавікі “Фоке-Вульф-190”!

- Паспееш яшчэ з “фокамі” паваяваць, - паморшчыўся яго брат Максім. – Вось пашлюць на нас дывізію Герынга “Рыхтгофен” – і будзеш шкадаваць, што ўвогуле пра гэта ўспомніў!

А Федарэнка з крываватай усмешкай сказаў:

- Нашы “лавачкіны” ўсё роўна лепш гэтых “фокаў”, як бы тых ні хвалілі. Савецкія канструктары не сядзяць без справы, пакуль немцы кляпаюць свае машыны смерці.

- Ды не, - умяшаўся Слаўка Новік, - як па мне, нельга не згадзіцца, што “Фоке-Вульфы” маюць шмат пераваг перад ЛА-5. Аднак многае залежыць і ад саміх лётчыкаў. Па гэтай прычыне часта здараецца так, што надзвычай моцныя нямецкія знішчальнікі не могуць перамагчы нашых самых пасрэдных “ішачкоў” І-16...

Рыгор, падняўшы руку, спыніў яго і сур’ёзна сказаў:

- Таму я яшчэ раз падкрэсліваю: колькі б ні было ў нас праціўнікаў і колькі б ні было нас саміх, усё залежыць ад таго, як мы будзем весці паветраны бой. Заўсёды памятайце пра гэта. А цяпер адпраўляемся!

Лётчыкі закрылі свае планшэты з картамі і сталі хутка выходзіць, адразу зрабіўшыся напружанымі і сканцэнтраванымі. Ліда была ўжо амаль ля дзвярэй, калі нехта паклаў ёй руку на плячо.

- Што... – рэзкавата пачала яна, але адразу змоўкла, калі, рыўком павярнуўшыся, убачыла перад сабой маёра Дубоўку. Чаго яму зноў ад яе патрэбна? І чаму ён проста глядзіць на яе, узвышаючыся над ёю, і нічога не гаворыць, нават руку з пляча не здыме?

Ліда стаяла і свідравала яго хмурным цяжкім позіркам, не звяртаючы ўвагі на тое, што ён быў яе камандзірам. Яна яшчэ не прабачыла яму тыя бязлітасныя словы, якія ёй прыйшлося ад яго выслухаць, і тую ганебную сітуацыю, якая адбылася ўчора ў камандным пункце, калі камандзір палка

лаяўся на Ліду апошнімі словамі, а яна, і без гэтага раззлаваная, павінна была стаяць і пакорна слухаць, каб не зарабіць дадатковыя непрыемнасці.

Некаторы час маёр усё гэтак жа глядзеў на яе і маўчаў. Нарэшце ён ціха сказаў:

- Яна напіша. Маці напіша.

У грудзях Ліды нешта балюча сціснулася, дыханне перахапіла. Яна толькі тады добра трымалася, калі выкідала з галавы непатрэбныя страшныя думкі, але, калі яны зноў авалодвалі ёю, яна адчувала асляпляльны жах, які паралізоўваў яе розум, не даваў спакойна разважаць, раз'ядаў знутры...

Ліда сціснула зубы і спадылба зірнула на Дубоўку. Навошта гэта ён? Назнарок, ці што? Можа, ён спецыяльна нагадаў ёй пра маці, каб яе горла перагарадзіў настойлівы камяк, які ў такія хвіліны замінаў ёй дыхаць?..

Але светлыя блакітныя вочы маёра, у якія Ліда насцярожана ўтаропілася сваімі цёмнымі вачыма, засталіся спакойнымі і сур'ёзнымі. У іх не было нават намёку на здзек.

- Напіша, - паўтарыў ён, і яго цяжкая рука ўсё ж такі саслізнула з пляча Ліды. Ён на секунду зажмурыўся і ўздыхнуў, а потым шпарка выйшаў, прыгнуўшыся, каб не зачапіцца за нізкі вяршнік.

***

Першае звяно "Лавачкіных-5", якое ўзначальваў Дубоўка на самалёце нумар тры, пранеслася па полі, адарвалася ад яго і зладжана паднялося ў паветра, а за ёю стартавала звяно Федарэнкі. Замыкаў групу Зелянкоўскі са сваімі вядзёнымі. Эскадрылля набрала вышыню, лягла на курс і панеслася ўперад насустрач "месершмітам", да якіх заставаліся нейкія кіламетры.

Максім Варановіч ляцеў справа ад "тройкі" маёра, а Ліда – злева. Як толькі маладая жанчына села ў самалёт, усё раптам зрабілася нязначным: і горкая крыўда на таварышаў-лётчыкаў за неразуменне, і дзіўныя паводзіны Дубоўкі, які быццам забыўся пра жудасны промах Ліды, і калючыя, бы

цярновыя шыпы, успаміны пра зласчасны ўчарашны дзень... Нават вострая трывога за маці неяк прытупілася, адышла на другі план. Зараз Ліда адчувала толькі чароўнае яднанне са сваім самалётам, які слухаўся кожнага яе руху, і лёгкае прыемнае галавакружэнне ад хуткасці і вышыні. У блакітных нябёсах не было ніводнай хмурынкі, сонца свяціла акурат ззаду – ці маглі існаваць лепшыя ўмовы для таго, каб першымі заўважыць праціўніка, а самім застацца нябачнымі?..

- Я Зубр пяць, я Зубр пяць! – прагучаў у навушніках голас Рыгора Дубоўкі. – Увага, уперадзе “месершміты”, “месершміты”!

Ліда да болю ў вачах угледзелася ўдалечыню і нарэшце распазнала далёкія рысачкі “месераў”. Яны ішлі даволі высока (нямецкія лётчыкі-знішчальнікі ўвогуле любілі забірацца на вышыню восем-дзевяць тысяч метраў, так званую “столь” сваіх самалётаў), але яны ўсё роўна апынуліся значна ніжэй, чым трэцяя эскадрылля.

Сэрца Ліды ўзбуджана закалацілася ў грудзях, у роце перасохла. Зараз бітва ёй патрабавалася больш, чым паветра, больш, чым усё на свеце! У самалёце бітва станавілася яе жыццём, і без яе нельга было існаваць! У бой, хутчэй у бой!

“Тройка” маёра пакачала крыламі – загадала рухацца за ёю – і паднялася недзе на тысячу метраў, каб заняць больш зручную пазіцыю. Эскадрылля накіравалася ўслед за Дубоўкам, а вопытны Мацвей Зелянкоўскі, які наперад ведаў усе намеры камандзіра, без падказкі пачаў забіраць яшчэ вышэй, каб яго звяно прыкрыла ўдарную групу зверху.

“Месершміты” набліжаліся. З рысачак на гарызонце яны ўжо ператварыліся ў выразныя вуглаватыя сілуэты ўнізе, але, мяркуючы па ўсім, нямецкія лётчыкі пакуль не заўважалі пагрозы. Магчыма, ім замінала сонца, а магчыма, яны проста не бачылі бела-блакітныя ЛА-5 на фоне неба.

- Я Зубр пяць, я Зубр пяць! Атака! – прагрымела ў навушніках.

Самалёт маёра нырнуў уніз, і Ліда панеслася за ім, зрываючыся ў крутое імклівае пікіраванне. Кроў загрукатала ў яе вушах, дыханне збілася, у грудзях задрыжала ад хвалявання, захаплення і прагнага жадання хутчэй апынуцца ўнізе, каб у апошні момант, калі да ворага застанецца некалькі дзясяткаў метраў, мсціва ўсадзіць у яго кароткую кулямётную чаргу і тут жа спрытна кінуцца ўгору, ведаючы, што ён ахутаўся дымам і праваліўся!..

У эфір нечакана ўварваліся палахлівыя адрывістыя фразы на дзіўнай рэзкай мове: немцы ўсё ж такі заўважылі эскадрыллю. Але ратавацца было позна, бо першае звяно ўжо падала на іх каршуном. Вялікія пальцы Ліды апынуліся на гашэтках, яна паймала адзін з "месераў" ў крыжык прыцэлу, затаіла дыханне... "Яшчэ ўбачыш, Дубоўка, як я магу!" – прамільгнула ліхаманкавая думка.

Раптам самалёт маёра пачаў прыцішаць хуткасць, і здзіўленая Ліда была вымушана таксама прытармазіць (як, зразумела, і другі вядзёны, Максім, а потым і звяно Федарэнкі, якое зніжалася следам за імі). Сотні здагадак успыхнулі і замітусіліся ў галаве Ліды: падбіты? заглух матор? спыняе атаку?.. Аднак "тройка" па-майстэрску выйшла з піке, завісла над "месершмітамі" на кароткія і разам з тым бясконцыя, бы размазаныя ў гэтым часавым прамежку секунды, і рашуча стрэліла доўгай бязлітаснай чаргою. Адзін з "месераў", які быў бліжэй за іншых, тут жа знік; Ліда, схамянуўшыся, рэзка націснула абедзве гашэткі, але прыцэл даўно збіўся, таму трасы прайшлі занадта высока над намечаным самалётам. Недзе справа са строю выпаў яшчэ адзін "месер": яго атакаваў Максім. У наступны момант "тройка" маёра па дыяганалі праскочыла над нямецкімі знішчальнікамі, якія таксама адкрылі агонь, і рванула ў вышыню. Лідзе прыйшлося спешна накіраваць свой самалёт за ім, каб па-ранейшаму ісці злева ззаду.

Лётчыца была моцна раззлавана. Некалі ёй ужо даводзілася лётаць з Дубоўкам у якасці вядзёнай, але з той пары прайшло даволі многа часу і

яна паспела забыцца на яго звычку памяншаць хуткасць у асобныя хвіліны бою. Гэта рабілася дзеля меткасці стральбы, каб забяспечыць поўнае знішчэнне праціўніка. Лідзе гэта надта ж не падабалася: яна аддавала перавагу спрытнасці і кароткім дакладным чэргам, якія джалілі самалёт ворага ў самыя слабыя месцы і прыводзілі яго ў непрыдатнасць. Шчыра кажучы, гэта было не вельмі надзейна, але ёй падабалася паказваць, якая яна ўмелая і вёрткая. Менавіта зараз ёй асабліва моцна хацелася прадэманстраваць свае здольнасці, бо ў яе галаве стаяла ўчарашняя жорсткая фраза Дубоўкі: "Я не пазбаўляю вас магчымасці прымаць удзел у вылетах, але зусім не па той прычыне, што лічу, быццам вы зможаце прынесці істотную карысць". Ліда тады вырашыла, што будзе ўпарта даказваць яму адваротнае. Яна жадала знішчыць як мага больш нямецкіх самалётаў, каб Дубоўку прыйшлося прызнаць, што яна патрэбна яго эскадрыллі. І вось зараз ён быццам назнарок пазбавіў яе гэтай магчымасці! У душы Ліды гарэла дзіцячая крыўда і драпалася кіпцюрамі злосць.

Звёны маёра і Федарэнкі ўзняліся высока ў неба, разышліся веерам і зноў кінуліся ўніз. Папярэдняй атакай яны дабіліся таго, да чаго імкнуліся: "месера" сыпанулі ў розныя бакі, і іх строй распаўся на дзве неаднолькавыя часткі. Іх, бясспрэчна, стала менш, і Ліда зрабіла вывад, што дзеянні другога звяна мелі значны поспех. Глеб накіраваў сваіх вядзёных на адну частку "месершмітаў", а Дубоўка – на другую. "Адзін самалёт – мой!" – рашуча падумала Ліда.

Аднак і на гэты раз усё адбылося не так, як ёй хацелася. Немцы не чакалі, пакуль ЛА-5 яшчэ раз іх абстраляюць; як толькі эскадрылля пачала зніжэнне, яны ўпэўнена адвярнулі ўбок, таму звяну Дубоўкі застаўся толькі адзін самалёт, які замарудзіўся і не паспеў за астатнімі. Ліда апынулася ў нязручным становішчы для стрэлу і не змагла яго атакаваць, і вораг ізноў дастаўся маёру. Калі б жанчына была адна, без вядучага, яна зрабіла б адзін хітры мудрагелісты манёўр і ўсё ж такі нагнала б "месер",

але зараз яна была вымушана пакорна ісці злева, як прыклееная. Ліду злавала тое, што яе звязалі па руках і нагах, ёй хацелася свабоды, прасторы, каб было дзе разгарнуцца, а яе трымалі ззаду, як быццам яна была неспрактыкаванай дзяўчынкай, якая магла сапсаваць усю справу.

Тым часам абставіны складаліся не на карысць савецкім лётчыкам. У пачатку бітвы быў дасягнуты эфект нечаканасці, што дазволіла ненадоўга захапіць ініцыятыву, але цяпер прыходзілася спадзявацца толькі на майстэрства. Частка самалётаў праціўніка была знішчана, але ў паветры заставалася яшчэ дастаткова ворагаў, якія не збіраліся так проста аддаваць перамогу. А трэцяя эскадрылля ўжо панесла першыя страты...

- Я Філін тры, я Філін тры! – уварваўся ў вушы Ліды напружаны голас, які імкнуўся прабіцца скрозь патрэскванні і шум у эфіры. – Вымушаны выйсці з бою! Паўтараю: выходжу з бою!

Краем вока Ліда заўважыла "чацвёрку" Зелянкоўскага, якая нырнула пад усе самалёты і паляцела прэч. Яна была жорстка паранена: частка крыла адарвана, фюзеляж у адмецінах ад куль, хвост моцна патрапаны... Напэўна, Зелянкоўскі, які час ад часу пікіраваў са сваім звяном на адзіночныя "месершміты", натрапіў на сур'ёзнае супраціўленне. Нават глядзець на яго "чацвёрку" было страшна, бо з'яўлялася такое ўражанне, што яна вось-вось сарвецца ў штопар. І як толькі Зелянкоўскі ўтрымліваў яе гарызантальна? Зараз яму заставалася або адразу выскачыць з парашутам, або паспрабаваць уратаваць самалёт і спешна пайсці на пасадку на нейкім полі, кожную секунду чакаючы, што перакулішся.

Адзін "месер" спакусіўся лёгкай здабычай і атакаваў бездапаможнага Зелянкоўскага, але на яго тут жа спікіравала "шасцёрка" Ігната Міхалёнка. Хлопец расправіўся з "месерам" першай жа чаргою і прыкрыў свайго вядучага зверху, дазваляючы спакойна зніжацца.

Неяк само па сабе здарылася так, што бітва ператварылася ў асобныя сутычкі, дзе проста не магло існаваць ніякага баявога парадку. Дзядзька

Мацвей і Ігнат выбылі, таму ад іх звяна застаўся адзін Лёва Русак, які вырашыў далучыцца да астатняй эскадрыллі. Як справы ў Глеба Федарэнкі, Ліда не бачыла, але яе ўласнае звяно распалася: на адным з віражоў немцы адсеклі Максіма, які зараз змагаўся недзе зусім убаку. Сама Ліда працягвала ўпарта трымацца каля Дубоўкі, каб у яго больш не было падстаў абвінаваціць яе ў самастойнасці. Аднак карысці гэта ўсё роўна не прыносіла, таму што раздражнёная, выбітая з каляіны Ліда пасля сваёй першай няўдачы пачала "мазаць", і чым далей, тым часцей. Гэта яшчэ больш выводзіла яе з сябе, бо са стральбою ў яе ніколі не было праблем. Дубоўка збіў два і зачапіў тры самалёты, а яна боўталася злева ад яго і толькі скрыпела зубамі ад сваёй поўнай непатрэбнасці. Навошта ўвогуле быць вядзёнай, калі большасць перамог прыходзіцца на камандзіра звяна?..

Нечакана міма Лідзінай "сямёркі" прамчаўся нейкі "лавачкін", на хвасце ў якога неадрыўна вісеў "месершміт". Мяркуючы па нумару пяць на фюзеляжы, "лавачкіным" кіраваў Слаўка Новік. Нягледзячы на ўсе яго хітрыкі, усе фігуры пілатажу, якія ён выпісваў у паветры, настойлівы немец ніяк не адлепліваўся. Ліда глянула на самалёт маёра: той ляцеў зусім у іншы бок і, напэўна, не заўважаў небяспечнага становішча таварыша. Маладая жанчына злосна нахмурылася і рашуча павярнула сваю "сямёрку", каб прыйсці на дапамогу Слаўку.

Ліда прыстроілася да "месера" ззаду справа, дачакалася зручнага моманту і з асалодай націснула гашэткі. Хісткае крыло нямецкага самалёта адразу адляцела, лёгка зрэзанае адзінай чаргою, і "месер" тут жа праваліўся. Ліда, сэрца якой замірала ад захаплення, зрабіла над ім пераможны круг. Ну вось і першы збіты самалёт! Варта было толькі адарвацца ад Дубоўкі – і ёй адразу пашанцавала! Потым яна яшчэ паспрачаецца з ім наконт пераваг і недахопаў звязкі "вядучы-вядзёны"!

Ліда, якую зноў ахапіла ўпэўненасць, дзелавіта агледзела неба ў пошуках праціўніка. Унізе яна заўважыла самалёт Федарэнкі, які паводзіў

сябе крыху дзіўна. Ліда добра ведала парывісты лётны почырк Глеба, таму яна насцярожылася, убачыўшы, што яго "дзявятка" няцвёрда рыскае ў паветры. Магчыма, Глеба параніла і цяпер ён усе свае сілы скіроўваў на тое, каб весці самалёт... Ліда акінула навакольную прастору зоркім позіркам і натрапіла на пару "месершмітаў", якая знаходзілася крыху вышэй за Федарэнку. Калі яны ўбачаць яго і накінуцца, ён ні пры якіх умовах не зможа адбіць атаку... Жанчына без разважанняў паляцела ў іх бок. "Спадзяюся, што на гэты раз, Глеб, ты не будзеш на мяне сварыцца", - падумала яна.

Ліда пранеслася міма "месераў" і ўвяла іх за сабою. Некаторы час яна прымушала іх беспаспяхова за ёю ганяцца, але потым выканала адзін са сваіх звычайных манёўраў, узяла на прыцэл першы з "месераў" і метка стрэліла. Распораты самалёт пачаў падаць; Ліда пераключыла ўвагу на другі і хацела збіць і яго таксама, але не заўважыла свае кулявыя трасы і жахнулася: патроны закончыліся! Што рабіць? Разгубленая Ліда хутка развярнула "сямёрку" і панеслася прэч, а "месершміт" паляцеў за ёю. Фюзеляж яе самалёта пачалі прабіваць кулі... Пакуль што Лідзе шчасціла і яны ў яе не траплялі, але ёй усё роўна зрабілася страшна: як ёй паводзіць сябе, калі яна бяззбройная, а бой працягваецца? "Можа, ён і не заўважыў, што я ў яго не стрэліла, хаця момант быў зручны, – таропка думала яна. – Можа, я змагу некаторы час валачы яго за сабой, а потым сябры ўратуюць мяне, як я ўратавала Слаўку..."

Аднак час ішоў, а дапамога не прыходзіла. Ліда бачыла, што астатнія таксама былі занятыя бітвай, ім было проста не да яе. Колькасць ворагаў у два разы паменшылася, але лягчэй ад гэтага не зрабілася, таму што сёння трэцяя эскадрылля сутыкнулася з даволі вопытнымі нямецкімі лётчыкамі.

"Разлічваць зараз можна толькі на сябе", - скалануўшыся, зразумела Ліда. Зразумела яна і тое, што ў яе засталася адзіная зброя.

Лабавая атака. Таран.

Толькі так яна знішчыць ворага.

Толькі гэты сродак можа ёй дапамагчы.

І разам з самалётам праціўніка павінен загінуць і яе ўласны самалёт, яе родная “сямёрка”.

А хутчэй за ўсё, і сама Ліда...

Ліда люта ўкусіла сябе за губу і рванула ўперад з такой хуткасцю, якой толькі магла дабіцца ад “сямёркі”. “Месер” паціху адставаў, а “лавачкін” бела-блакітнай ракетай імчаўся ўсё далей і далей, не звяртаючы на гэта ўвагі. Потым ён залажыў круты віраж, змяніў напрамак руху і панёсся проста на “месершміт” – лоб у лоб. Ліду ўціснула ў крэсла, галава ў яе закружылася, на скронях выступілі кропелькі халоднага поту... Яе сэрца гарачкава заходзілася ў няроўных ударах, быццам жадала за некалькі секунд адстукаць усе тыя, якім было ўжо не суджана прагучаць... Уперадзе рос корпус нямецкага самалёта, які ні ў якім разе не збочыць, ні за што на свеце не ўхіліцца – гэта было чамусьці відавочна для Ліды. Яна імкліва ляцела яму насустрач, і ў яе галаве не было зусім ніякіх думак, толькі пякучае, невыноснае жаданне: хутчэй бы ўсё гэта нарэшце скончылася...

...Але ў апошняе імгненне, калі адлегласць паміж самалётамі небяспечна скарацілася, на “месершміт” спікіраваў нейкі савецкі самалёт. Ён ляцеў так хутка, што здавалася, быццам паветра само расступаецца перад ім, яно баіцца – баіцца і яго самога, і яго гневу, і таго, што можа здарыцца ў наступную секунду. Ён падаў на “месер” драпежнай птушкай, падаў няўхільна і бязлітасна. Але да каго ж ён быў бязлітасны, да “месера” ці да сябе?..

Самалёт пранёсся апошнія метры да ворага – і ўрэзаўся носам у яго бок. Прамільгнула і тут жа знікла вялікая тройка на бела-блакітным фюзеляжы, пачуўся страшны трэск і грукат, паляцелі абломкі... Ліда паспела яшчэ рвануць ручку на сябе і кінуць “сямёрку” ўверх, на выратавальную вышыню. У наступны момант рэшткі савецкага і

нямецкага самалётаў узарваліся – полымя шыбанула ва ўсе бакі, неба заслала воблака чорна-бурага дыму...

Лідзіна “сямёрка” выскачыла на чыстае паветра, і лётчыца ліхаманкава выраўняла палёт. Яе ўсю калаціла, яна ледзь магла кіраваць самалётам. Ліда глядзела ўніз шырока расплюшчанымі вачыма і нічога не бачыла: перад яе ўяўным позіркам стаяла лічба тры, якую яна заўважыла на “лавачкіну”. Такі нумар меў знішчальнік маёра Дубоўкі... “Не, не можа быць, каб ён загінуў... – паўнепрытомна думала Ліда. – Не можа быць... Не можа...” Яна пачала апісваць вялікія кругі над месцам трагедыі, пранізваючы задымленае паветра адчайным позіркам, але нічога абнадзейлівага не заўважала. Яе рукі вельмі дрыжалі, а дыханне было частым і перарывістым.

- Ну навошта ён, навошта... – шаптала яна перасохлымі вуснамі, і з кожным словам у яе душы нешта разрывалася. – Лепш бы я, я сама... Не трэба было... Навошта...

Зверху на Лідзіну “сямёрку” ляцеў нейкі “месершміт”, але яна не звяртала на гэта ўвагі. Ёй нават хацелася, каб ён збіў яе. Яна не павінна існаваць, раз усе людзі гінуць ад адной яе прысутнасці... Спачатку Сярожка, цяпер маёр... Ніхто з іх не заслугоўваў смерці, яны маглі пражыць доўгае-доўгае жыццё. З-за яе гэта цяпер немагчыма...

На “месершміт”, які пагражаў Лідзе, сярдзіта накінуўся Ігнат Міхалёнак на сваёй “шасцёрцы” – і калі ён толькі паспеў вярнуцца? Не прайшло і пяці секунд, а “месер” ужо задыміў і пачаў падаць, але недзе справа адразу, быццам у адказ, уніз паляцеў безнадзейна знявечаны “лавачкін” Арцёма Варановіча. Душэўны боль Ліды зрабіўся нясцерпным, і ёй вельмі захацелася заплакаць, але ў яе гэта чамусьці не атрымалася. Мабыць, на вайне яна развучылася...

Рэшткі трэцяй эскадрыллі працягвалі змагацца, але ў некаторых ужо не было боепрыпасаў, а самалёты астатніх былі моцна патрапаны. “Хутка

скончыцца паліва”, - з вялай трывогай падумала Ліда, зірнуўшы на бензамер. Бой цягнуўся занадта доўга, яго даўно трэба было завяршыць. І эскадрыллі цяпер не выйсці з яго так проста: нагоняць і знішчаць. Калі б тут быў Рыгор Дубоўка, ён абавязкова штосьці прыдумаў бы, знайшоў бы выхад з гэтай сітуацыі, але яго больш няма і ніколі не будзе... А без яго яны быццам сляпыя кацяняты...

Раптам погляд Ліды натрапіў на нешта зусім нечаканае: разразаючы паветра, да іх ўпэўнена ішла група савецкіх самалётаў – “аэракобраў” Р-39 з суседняга аэрадрома. Здаецца, яны толькі што былі далёка-далёка, але вось ужо першыя з іх пачынаюць праносіцца над галовамі і спрытна пікіраваць на “месершміты”. Іх многа, іх больш, чым ворагаў, у іх поўныя боекамплекты і бензабакі, іх лётчыкі свежыя, не стомленыя... У эфіры загучалі таропкія нямецкія каманды, і апошнія дзевяць “месераў” зрабілі спробу спешна перастроіцца ў баявы парадак, каб аказаць належнае супраціўленне, але “аэракобры”, гэтая нябесная эліта, не далі ім такой магчымасці. Яны віхрам наляталі на варожыя самалёты і адсякалі ім крылы, хвасты, прабівалі абшыўку, знішчалі маторы... Яны дзейнічалі так імкліва і зладжана, што трэцяя эскадрылля, выматаная да знясілення, выглядала на іх фоне маруднай і зморанай. Яна чымсьці нагадвала групку параненых дварнякоў, якія да апошняга змагаліся з воўчай зграяй і змаглі пратрымацца да паяўлення крэпкіх, моцных паляўнічых псоў.

“Аэракобры” рабілі сваю справу добра, таму неба хутка пусцела. У глыбіні пакрамсанай душы Ліды загарэлася слабая іскрынка павагі і падзякі: суседзі прыйшлі на дапамогу вельмі своечасова, “лавачкіны” ніяк не ўправіліся б адны. Аднак цяпер маладая жанчына проста не магла ні пра што думаць, бо занадта многа ўсяго здарылася. Яна быццам пражыла цэлае жыццё за гэты паветраны бой... Ёй хацелася толькі аднаго: зараз жа вярнуцца на аэрадром.

“Чаму мы застаемся тут, чаму не ляцім? Бітва ўжо скончана! – крыху раздражнёна падумала Ліда і яшчэ раз кінула позірк на бензамер. – Хопіць хвілін на дзесяць, а потым...”

І нечакана яна зразумела.

Не было нічога дзіўнага ў тым, што “лавачкіны” разгублена кружылі на адным месцы. Яны не адважваліся ляцець паасобку, чакалі загаду. Але хто мог аддаць гэты загад, калі іх камандзір загінуў? Калі б спыталі Ліду, яна без разважанняў сказала б, што зараз іх кіраўніком можа стаць дзядзька Мацвей як самы вопытны пасля Рыгора Дубоўкі. Аднак ён выйшаў з бою, таму прыходзілася адмовіцца ад гэтага варыянта. Таксама Ліда лічыла вельмі добрым лётчыкам Глеба Федарэнку, нягледзячы на тое што яны цапаліся амаль пры кожнай сустрэчы. Але і ён не быў здольны іх узначаліць, бо, мяркуючы па ўсім, яго параніла і яму самому патрабаваўся той, хто дапамог бы арыентавацца. Дык хто ж застаецца? Слаўка? Русак? Міхалёнак?..

Ліда напружылася ў крэсле, хуткім рухам уключыла радыёперадатчык і закрычала ў яго:

- Я Пантэра два, я Пантэра два! Усе да мяне, вяртаемся на аэрадром! Я Пантэра два, усе да мяне!

Трэцяя эскадрылля быццам здабыла надзею. Максім Варановіч хуценька прыстроіўся да Ліды вядзёным, за імі сталі Глеб і Слаўка (на гэты раз месца вядучага заняў апошні), а Лёва Русак і Ігнат апынуліся ззаду. Звёны засталіся ў ранейшым парадку і складаліся з тых жа самых людзей, але тым ясней было бачна, колькіх сярод іх не хапала...

Ліда зірнула на компас, пакачала крыламі сваёй “сямёркі” і накіравала яе прама ў бок аэрадрома. Як часта яна раней марыла вось так ляцець уперадзе ў якасці камандзіра групы, як часта ёй хацелася ўзначаліць сапраўдны баявы вылет! Вось мары здзейсніліся, а яна не адчувае нічога,

акрамя цяжкай, глухой стомленасці. Занадта ж гэта адказная справа, занадта многа людзей залежаць ад яе, Ліды...

У асноўным палёт прайшоў спакойна. Больш за ўсё Ліду трывожыў Федарэнка, самалёт якога перыядычна правальваўся ў паветраныя ямы і кожны раз прымушаў яе ўздрыгваць. Яна ўвесь час баялася, што Глеб не зможа дацягнуць да аэрадрома. Некалькі разоў яна парывалася выклікаць яго па радыё, каб спытаць пра самаадчуванне, але тут жа адмаўлялася ад гэтай думкі. Федарэнка быў вельмі гордым чалавекам, ёй ні ў якім разе не прызнаўся б ва ўласнай слабасці.

Калі нарэшце паказаўся аэрадром, Ліда ўздыхнула з палёгкай. Толькі зараз да яе прыйшло разуменне таго, як жа моцна яна была сканцэнтравана. Лётчыца не стала рабіць над аэрадромам звычайны круг, яна проста выпусціла шасі і пайшла на пасадку, а за ёю сталі прызямляцца і астатнія самалёты.

Як толькі “сямёрка” прабегла па полі і спынілася, а вінт перастаў круціцца, Ліда сцягнула з галавы шлем і змучана схавала твар у далонях. Тут, на зямлі, калі адпала неабходнасць клапаціцца пра сваю эскадрыллю, маладую жанчыну зноў ахапіў боль незваротнай страты. Маёр Дубоўка ўратаваў яе – і заплаціў за яе жыццё сваім... Яшчэ ўчора ён, здаецца, сам быў гатовы яе забіць, а сёння без разважанняў кінуў “тройку” ў апошняе страшнае пікіраванне, каб Ліда магла жыць далей. Магчыма, такімі і павінны быць камандзіры эскадрылляў: здольнымі дзеля сваіх лётчыкаў адмовіцца ад усяго на свеце... І ад самога свету таксама.

Ліда адкінула каўпак, перабралася на крыло і цяжка саскочыла на зямлю. Глеб Федарэнка спрабаваў выйсці з кабіны, але гэта ў яго дрэнна атрымлівалася: яго левая нага была прастрэлена ў бядры, на што паказвала вялікая цёмная пляма на сінім камбінезоне. Ён лаяўся скрозь сціснутыя зубы і адмахваўся ад санітараў, якія спрабавалі яму дапамагчы. Астатнія лётчыкі таксама пакідалі свае самалёты, але нікуды не ішлі, заставаліся на

месцы. Усе яны выглядалі разгубленымі і прыгнечанымі, асабліва Максім, які страціў сёння не толькі камандзіра, але і роднага брата.

Сярод механікаў, якія няведама калі паспелі апынуцца тут, ля самалётаў, Ліда заўважыла постаць высачэзнага Зелянкоўскага, які трывожна ўглядаўся ў лётчыкаў трэцяй эскадрыллі. Напэўна, ён удала пасадзіў сваю "чацвёрку" недзе ў полі, а свае падвезлі яго да аэрадрома. Твар дзядзькі Мацвея быў шэрым і амярцвелым: зразумела, капітан заўважыў адсутнасць двух самалётаў.

Побач з Зелянкоўскім стаяў камандзір іх палка Якімовіч – лысаваты немалады мужчына са светлымі вусамі. Звычайна сярдзіты, прыдзірлівы, зараз ён выглядаў незвычайна ціхім. Менавіта да яго і накіравалася Ліда. Слаўка, Ігнат, Лёва і Максім чамусьці сталі таксама падбірацца бліжэй, як быццам не ведалі, што ім рабіць і куды ісці.

Ліда падышла да палкоўніка Якімовіча і спынілася. Яе спіна была вельмі прамой, як і заўсёды, а вочы глядзелі стомлена. Чаму гэтая сітуацыя так нагадвае ёй учарашні дзень?..

- Дазволіце далажыць, таварыш палкоўнік? – нейкім драўляным голасам спытала яна.

У Якімовіча вырваўся няпэўны кашляючы гук, які мог сысці за дазвол, і яна сіпла сказала:

- У паветраным баі знішчана адзінаццаць "месершмітаў", астатнія дзевяць збіты групай "аэракобраў", якія ўступілі ў бітву крыху пазней. З нашага боку... – Тут гаварыць стала зусім цяжка, таму яна спачатку зрабіла глыбокі ўдых і толькі потым выціснула: - З нашага боку таксама ёсць ахвяры. Гэта старшы сяржант Арцём Вdespite Варановіч і... і маёр Рыгор Дубоўка.

Зелянкоўскі, які, напэўна, да апошняга спадзяваўся, што "тройка" яшчэ прыйдзе, закрыў твар рукамі.

Ліда хацела працягваць, але Слаўка Новік хрыпла перапыніў яе:

- Хопіць, Ліда, хопіць! Ты белая, страшэнна белая – амаль як мел! Спыніся, інакш прытомнасць страціш!

Не слухаючы яго, Ліда слаба прагаварыла:

- Абставіны, у якіх загінуў старшы сяржант, мне невядомы, але маёр... Я хацела здзейсніць лабавую атаку на “месершміт”, а маёр апярэдзіў мяне і... і пратараніў яго сам... Атакай зверху...

Голас Ліды канчаткова сарваўся, а збоку пачуліся дзіўныя здаўленыя гукі: гэта разрыдаўся капітан Зелянкоўскі, які працягваў хаваць твар у далонях. Лідзе таксама хацелася заплакаць, каб тугі вузел, які балюча закручваўся ў грудзях, пакінуў так моцна ціснуць, але вочы па-ранейшаму заставаліся сухімі. “Я нават не паспела папрасіць у Дубоўкі прабачэння, - адчужана падумала яна, гледзячы ў пустэчу невідушчым позіркам. – За тое, што з-за меня загінуў Сярожка”.

Якімовіч падышоў да Ліды на крок бліжэй.

- Не гавары больш нічога, не трэба... – глуха сказаў ён і зусім злёгку, па-бацькоўску страсянуў яе за плечы, паклаўшы на іх свае дрыжачыя рукі. – Ты малайчына, што прывяла эскадрыллю, малайчына... Ты вельмі добрая лётчыца, Ліда. І не абвінавачвай сябе ў тым, што здарылася... Ён сам так вырашыў, разумееш?

Ліда маўчала і не глядзела на яго.

- Ідзі адпачываць, мілая. Ідзі і ні пра што не думай, - незвычайна мякка вымавіў ён і адступіў.

Нехта падышоў да яе збоку і ўклаў штосьці ў руку.

- Трымай, Ліда. Гэта табе, - нягучна сказаў Саша Міхееў.

Ліда аўтаматычна перавяла позірк на далонь: у ёй быў патрапаны мяты канверт са знаёмым няцвёрдым почыркам. Маладая жанчына павольна распячатала яго знямелымі пальцамі і дастала невялічкую паперку, якая была дробна спісана з абодвух бакоў.

*Даражэнькая дачушка!*

*Мне вельмі сорамна за тое, што я так даўно не пісала табе. Даруй мне, калі можаш... У нашу вёсачку прыйшлі немцы і падпалілі яе, але мы паспелі ўцячы ў лес і ўратаваліся. Дагэтуль я не мела ніякай магчымасці адправіць табе нават кароценькую запіску, але зараз усё добра, бо...*

Радкі пачалі расплывацца перад вачамі Ліды, і на паперку закапалі доўгачаканыя слёзы. Жанчына перарывіста ўсхліпнула і ціха расплакалася, а ў памяці яе ўспыхнулі ясныя светла-блакітныя вочы Рыгора Дубоўкі, які зусім нядаўна стаяў насупраць яе і сур'ёзна гаварыў: "Маці напіша..."